# АВАРЫЙНЫЯ БУДЫНКІ ЦІ ГІСТАРЫЧНАЯ СПАДЧЫНА?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Упершыню аб нязручным размяшчэнні квартала загаварылі ўжо ў 1970-я. Тады горадабудаўнікі хацелі, але не змаглі пашырыць вуліцу Горкага (цяперашнюю — Багдановіча). Да пытання аб мэтазгоднасці захавання двухпавярховых будынкаў у цэнтры сталіцы вярнуліся ў канцы 1990-х і яшчэ раз у 2000-х. Апошняя, пакуль незавершаная спрэчка зацікаўленых бакоў — горада і жыхароў раёна — пачалася два з лішнім гады назад.

Козыр горада — экспертнае меркаванне спецыялістаў-будаўнікоў, якія сцвярджаюць, што амартызацыйны тэрмін эксплуатацыі падобных будынкаў 50 гадоў, такім чынам, іх ужо трэба было знесці. Прычым, не лепшы стан жылога фонду прыносіць нязручнасці, у першую чаргу, самім жа насельнікам раёна. Але ініцыятыўныя гараджане ўпэўненыя, што квартал з'яўляецца ўнікальным у сваім родзе і пры правільным падыходзе можа зрабіць Мінск больш прывабным для турыстаў.

Раён будаваўся з перспектывай доўгага існавання: першапачатковa двары і тратуары былі выкладзеныя даўгавечным брукам, а дахі накрыты чарапіцай.

Гэтай восенню мясцовыя жыхары сабралі больш за 350 подпісаў пад зваротам у Міністэрства культуры з просьбай надаць кварталу статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Раней з падобнай ініцыятывай у Мінкульт звярнулася грамадская арганізацыя «Гісторыка».

Канчатковае рашэнне яшчэ не вынесена, аднак праект на выпадак зносу раёна ўжо існуе. Апублікаваны летась новы генплан Мінска прадугледжвае, што вуліца Багдановіча (паралельная праспекту Незалежнасці) усё ж такі праз 40 гадоў будзе рэканструявана, пашырана для таго, каб разгрузіць цэнтральную магістраль. Прапануецца павялічыць шырыню праезнай часткі дарогі да пяці палос. А на месцы двухпавярховак павінен з'явіцца новы жылы комплекс.

Момант прыняцця рашэння па лёсе раёна быў адкладзены па аб'ектыўных прычынах: зараз Мінгарвыканкам сумесна з ініцыятыўнымі грамадскімі дзеячамі распрацоўвае менеджмент-план, які дазволіць вызначыць перспектывы захавання і развіцця гэтай тэрыторыі ў тым выглядзе, у якім яна існуе цяпер.

Краевугольным каменем з'яўляецца тое, што калі раёну ўсё ж будзе прысвоены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, то рэканструяваць і нават рамантаваць жылыя будынкі стане праблематычна: любыя змены ў іх аблічча трэба будзе ўзгадняць не ў адной інстанцыі. Нельга адмаўляць, што многія будынкі маюць вострую патрэбу ў капітальным дарагім рамонце ўжо зараз. І ўзнікае пытанне: ці сапраўды «барацьба» выкліканая іх рэальнай каштоўнасцю, а не нежаданнем жыхароў расставацца з асабістымі настальгічнымі ўспамінамі дзяцінства і юнацтва?



Калі раён усё ж захаваюць, то з цягам часу ён з жылога ператорыцца ў культурна-забаўляльны. Але такім чынам сталіца мала таго, што пазбавіцца ўжо існуючага жылога фонду, дык яшчэ і страціць тэрыторыі, на якіх маглі б з'явіцца так патрэбныя мінчанам новыя камфартабельныя шматкватэрныя дамы. Менавіта таму ў праекта ёсць і праціўнікі: складана растлумачыць тым, хто чакае сваёй чаргі на кватэру дзесяцігоддзі, чаму важна захаваць нерацыянальныя двухпавярхоўкі ў цэнтры горада.

Аднак жыхары Асмалоўкі з такім меркаваннем не згодны: яны лічаць, што жылую і культурную функцыі можна паспяхова аб'яднаць. Добра, вопыт такі ўжо ёсць: у сярэдзіне мінулага стагоддзя ўсе святы тут адзначалі цэлым кварталам. Летась традыцыі пастараліся адрадзіць, так былі праведзены калядны, масленічны і велікодны фэсты, фестывалі суседзяў і варэння, свята-конкурс «Кошкі на акенцы», публічны майстар-клас па ўліку дрэў, сумеснымі намаганнямі была распісана трансфарматарная будка.

Яшчэ адна прычына, па якой актывісты змагаюцца за Асмалоўку, — гэта тое, што раён з'яўляецца адным з самых зялёных у горадзе. Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя накіравала ў Мінкульт ліст пра важнасць захавання зялёных тэрыторый гэтага квартала. Па падліках эколагаў, для стварэння такой жа зялёнай зоны спатрэбіцца мінімум 70 гадоў. Паспеюць вырасці два пакаленні, а калі ўлічыць, што ва ўмовах дэфіцыту азелянення ў Мінску ўжо пражывае каля 275 тысяч чалавек... Але што да гэтага тым, у каго другое пакаленне гадуецца ў пакоі інтэрната? Вось і ўгадай, чыя праўда праўдзівейшая...

### Безаблічныя функцыянальныя шматпавярхоўкі або ўтульныя двары Сельгаспасёлка?

Не атрымалася пазбегнуць канфліктнай сітуацыі і жыхарам так званага Сельгаспасёлка Савецкага раёна сталіцы. Для горада, які імкліва развіваецца, такія велізарныя ўчастак, заняты прыватным сектарам, стаў сур'ёзнай праблемай.

У цэнтры ўвагі, як і ў выпадку з Асмалоўкай, — усё тая ж вуліца Багдановіча (далей, у бок Зялёнага Луга). Недастаткова шырокая магістраль не спраўляецца з інтэнсіўным транспартным патокам. Да таго ж у перспектыве тут павінна прайсці новая лінія метро, пачатак будаўніцтва якой запланаваны аж на 2025 год, таксама, хутчэй за ўсё тут будзе закладзена развязка трэцяга транспартнага кальца. Тым не менш жыхары раёна катэгарычна супраць зносу сваіх дамоў.

Яшчэ генплан Мінска 1982 года, які атрымаў, дарэчы, прэмію Савета Міністраў, прадугледжваў ліквідацыю гэтай малапавярховай забудовы. Тады раён не знеслі — у хуткім часе пачалася перабудова ва ўсёй краіне, рукі да перабудовы асобна ўзятага пасёлка не дайшлі. Але ў 2010 годзе рашэнне аб кардынальных зменах было прынята канчаткова. Да будаўнічых работ доўгі час справа не даходзіла, і, калі да спрэчнага пытання вярнуліся, паднялася хваля пратэстаў сярод мясцовых жыхароў. Вырашана было пераглядзець праект, каб па магчымасці захаваць максімальную колькасць дамоў. У выніку пад знос павінны пайсці 614 прыватных дамоў, застанецца толькі 281.

Актывісты накіравалі ў адміністрацыю Савецкага раёна дзесяцістаронкавы дакумент, які змяшчае ў сабе шматлікія каментарыі па праекце. Пакуль ніякія будаўнічыя работы на тэрыторыі Сельгаспасёлка не пачаліся, але, нягледзячы на пратэсты, захаваць яго ў цяперашнім выглядзе дакладна не атрымаецца.

Да 2030 года, паводле генплана, аблічча раёна павінна кардынальна змяніцца: новыя жылыя комплексы, шматфункцыянальныя цэнтры, паліклініка, дзіцячыя сады і школы. Але больш ніякіх утульных двароў і вузкіх вулачак, якія мімаволі нагадваюць кранальныя вясковыя. Аднак такую «раскошу» не можа дазволіць сабе ні адзін буйны горад: вёска вёскай, а мегаполіс павінен развівацца па іншых правілах.

* * *

А вось пра тое, як грамадскае меркаванне ўплывае на аблічча горада, красамоўна кажа гісторыя парка Котаўка, які размяшчаецца ў тым жа раёне. Выпадак з самага пачатку хутчэй нетыповы, бо на тэрыторыі парку збіраліся будаваць не жыллё, а культавы будынак. Супраць выказаліся эколагі і неабыякавыя мясцовыя жыхары. Яны лічаць азеляненне раёна і так нездавальняльным, а дадатковая высечка дрэў магла б зрабіць сітуацыю крытычнай. Тым не менш у пачатку снежня ў парку пачаліся падрыхтоўку да будаўнічых работ.

Аднак насустрач тэхніцы «Мінскзеленбуда» «з боем» выйшлі мясцовыя жыхары. Супрацьстаянне працягвалася дзевяць гадзін, пасля чаго работы былі прыпыненыя. На днях стала вядома, што ўзводзіць храм у парку ўсё ж такі не будуць. Старшыня Мінгарвыканкама Андрэй Шорац прапанаваў грамадскім арганізацыям і актывістам, якія выступалі за захаванне дрэў, прыняць удзел у азеляненні сквера.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

---

■ Смачна есці!

# КАБ ГРАМАДСКАЕ БЫЛО ЯК ХАТНЯЕ,

## ці Як прывіць беларусам звычку снедаць у кавярнях



**У маі 2016 года распараджэннем прэм'ер-міністра была створана міжведамасная рабочая група на чале з міністрам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзімірам Калтовічам для выпрацоўкі прапаноў па ўдасканаленні арганізацыі грамадскага харчавання. Перад ёй была пастаўлена задача прааналізаваць умовы ажыццяўлення гаспадарчай дзейнасці ў гэтай сферы. Якія праблемныя пытанні ў арганізацыі грамадскага харчавання былі выяўлены? Якія фактары, на думку экспертнай супольнасці, стрымліваюць развіццё гэтага сегменту спажывецкага рынку і што неабходна зрабіць, каб іх нівеліраваць? Гэтыя і іншыя актуальныя пытанні развіцця сферы грамадскага харчавання абмеркавалі эксперты падчас «круглага стала» ў БЕЛТА. Прапануем чытачам найбольш цікавыя, на наш погляд, адказы на пытанні намесніка міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Ірыны НАРКЕВІЧ.**

### Улічыць прапановы ўсіх бакоў

***— Паўгода таму была створана міжведамасная рабочая група па грамадскім харчаванні. Якіх вынікаў удалося дабіцца за час яе працы?***

— Рынак развіваецца. На пэўным этапе трэба было прымяняць жорсткае рэгуляванне. Але час ідзе, і цяпер гэта ўжо не патрабуецца. Першыя крокі па лібералізацыі былі зроблены ў 2009 годзе. Цяпер настаў другі этап, і гэта своечасова.

**«Сёння рынак сфарміраваўся, бізнес аналізуе пакупніцкі попыт, сусветныя тэндэнцыі і разумее, які асартымент будзе запатрабаваны».**

Міністэрства пачало з сябе: мы сталі апускаць планку сваіх нарматываў. Падрыхтаваны і ўнесены ў Міністэрства юстыцыі змяненні ў Правілы гандлю. У прыватнасці, мяркуецца, што наведвальнікам будзе дадзена магчымасць прынесці з сабой харчовую прадукцыю і тавары, за выключэннем забароненых да выкарыстання. Але, безумоўна, з дазволу адміністрацыі аб'екта грамадскага харчавання. Зараз гэтая норма не ўрэгулявана. Вядома, наўрад ці можна будзе прынесці ў рэстаран ежу ўласнага прыгатавання, але, напрыклад, выпечаны ў кандытарскай святочны торт — чаму і не?

**«На пэўным этапе трэба было прымяняць жорсткае рэгуляванне. Але час ідзе, і цяпер гэта ўжо не патрабуецца».**

З нядаўняга часу суб'ектам дадзена права цалкам самастойна вызначаць асартыментную палітыку аб'екта, яго спецыялізацыю. Бізнесмены выступалі за самастойнае фарміраванне асартыменту, абапіраючыся на веданне пакупніцкага попыту. Пытанне дыскусійнае, але надышоў час, калі рэгуляванне тут не патрэбна. У свой час была высокая рызыка ўсім рэстаранам ператварыцца ў прадпрыемствы, якія прапануюць фаст-фуд. Каб гэтага пазбегнуць, была ўведзена класіфікацыя. Сёння рынак сфарміраваўся, бізнес аналізуе пакупніцкі попыт, сусветныя тэндэнцыі і разумее, які асартымент будзе запатрабаваны.

### Стаўка — на нацыянальнае

***— Якіх змен чакаць у сферы рэгулявання грамадскага харчавання ў бліжэйшы час?***

— Каб яна больш актыўна развівалася, недастаткова толькі нарматыўна-прававых рашэнняў. Трэба прывіваць культуру паводзінаў. Беларусы не прывыклі снедаць і абедаць у рэстаранах, кавярнях. Хоць, напрыклад, ланчы ў многіх установах па досыць прымальным кошце. Зноў-такі, кубак кавы выпіць, пасядзець.

Асаблівая ўвага — нацыянальнай кухні. Зараз на выпуску такіх страў спецыялізуюцца 229 рэстаранаў, кавярняў, бараў. У 2016 годзе за кошт новага будаўніцтва, пераспецыялізацыі адкрыта 9 нацыянальных устаноў (у 2015 годзе — 49). Праводзіцца дні беларускай кухні, выставы-продажы і дэгустацыі, майстар-класы па прыгатаванні страў. У Мінску традыцыйным стаў Тыдзень беларускай кухні, калі ў рэстаранах і кавярнях прапануюцца стравы, прыгатаваныя па адзіных тэхналагічных дакументах (рэцэптурах) і аднолькавых цэнах, незалежна ад тыпу і класа аб'екта. У сувязі з гэтым трэба казаць і пра турыстычны патэнцыял краіны. Вядома, мы за спрашчэнне візавага рэжыму. Гэта будзе спрыяць таму, каб рэстаранны бізнес развіваўся, у тым ліку побач з гістарычнымі і культурнымі аб'ектамі. У бізнесу шмат прапаноў. І мы павінны чуць усё без выключэння. Прычым не проста чуць, а дапамагаць. Як кажа кіраўнік дзяржавы, зрабіце празрыстымі правілы гульні і не чапайце, хай яны развіваюцца. Гэта пытанне комплекснае, і мы будзем гэтым займацца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by* ■